прапагандавалі каштоўнасць гэтых ідэй сярод насельніцтва. Дзейнасць ложаў была непарыўна звязана з нацыянальна-вызваленчым рухам у Літве і Беларусі. Іх задачай было дасягненне палітычнай і культурнай самастойнасці краю. Менавіта таму яны і падтрымлівалі ідэю стварэння “Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага”, аднаўлення беларуска-літоўскай дзяржавы.

Выкарыстаная літаратура:

1. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці / М.П. Касцюк [і інш.] – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 614 с.
2. Дабранскі С. Нарысы з гісторыі масонства ў Літве / С. Дабранскі // Спадчына. – 1997 – № 3. – С. 60–74.
3. Смалянчук А. Дзённік М. Ромера / А. Смалянчук. // Спадчына. – 1998. – № 5. – С. 59–67.
4. Смалянчук А. “Краёвасць” у беларускай и літоўскай гісторыі 1905-1940 гг. / А. Смалянчук // Беларускі гістарычны агляд. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1-2. – С. 19–33.
5. Смалянчук А. З гісторыі віленскага масонства XX ст. / А. Смалянчук // Спадчына. – 1998 – № 5. – с. 50–59.

## ВЫТОКІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ: ПЫТАННІ ВЫВУЧЭННЯ І РАЗВІЦЦЯ

Багдановіч А.Б.,г. Мінск, ДУА “Камандна-інжынерны інстытут” МНС Рэспублікі Беларусь

У гісторыі ёсць значныя навуковыя праблемы, якія будуць заставацца актуальнымі на працягу доўгага часу. Да іх адносіцца і фармаванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Параўнальна нядаўна гэтая тэма “не мела статуса самастойнай навуковай праблемы” [1, с. 42]. Пры тым, што этнічная самасвядомасць – з’ява выключнай складанасці, у савецкія часы шэраг навукоўцаў імкнуліся ўскласці адказнасць за “відавочную заблытанасць праблемы” на даследчыкаў, “якія выражалі інтарэсы эксплуатататарскіх класаў” [2, с. 80].

У Расійскай імперыі праца па вывучэнні этнічнай самасвядомасці была распачата ў другой палове XIX ст. Так, у 1872 г. у Пецярбурзе праходзіў міжнародны статыстычны кангрэс, удзельнікі якога прыйшлі да высновы, што нацыянальная

прыналежнасць не тоесна моўнай, а яе вызначэнне павінна асноўвацца на самасвядомасці асобы.

Рускі гісторык Вадавозаў у пачатку XX ст. пісаў: “Калі чалавек лічыць сябе палякам, значыць, ён паляк, хоць бы ён не быў каталікам, хоць бы ён быў адарваны ад польскай тэрыторыі і хоць бы ён забыў сваю мову… Калі чалавек, які нарадзіўся ад польскіх бацькоў, адмаўляецца ад наймення паляка, то, хоць бы ён жыў у Польшчы, яго ўсё ж не належыць лічыць за паляка. Такі адзіны рацыянальны прынцып, якога належала б трымацца” [3, с 732].

У савецкай навуцы замацавалася шырока вядомае вызначэнне нацыі, дадзенае І. В. Сталіным на аснове чатырох адзнак: а) агульнасці мовы; б) агульнасці тэрыторыі; в) агульнасці эканамічнага жыцця; г) агульнасці псіхічнага складу, які праяўляецца ў агульнасці культуры. У лік гэтых адзнак не была ўключана прыкмета нацыянальнай самасвядомасці, але ўсё ж пытанні этнічнай самасвядомасці ў той час распрацоўваліся. Так, П. І. Кушнер апублікаваў у 1949 г. у “Кратких сообщениях института этнографии” артыкул аб значэнні нацыянальнай самасвядомасці як паказчыку этнічнай прыналежнасці. Аўтар падкрэсліваў, што нацыянальная самасвядомасць развіваецца з прымітыўных форм усведамлення этнічнай супольнасці і праходзіць шэраг этапаў, якія адпавядаюць стадыям развіцця грамадства. М. М. Чабаксараў таксама пісаў, падкрэсліваючы істотнасць згаданай праблемы: “Узаемадзеянне адзінак (мова, тэрыторыя, культура), іх уплыў на ўтварэнннне і захаванне этнічнай супольнасці праяўляецца ў выглядзе другаснай з’явы – этнічнай самасвядомасці” [4, с 23].

У 1966 г. у часопісе “Вопросы истории” была пачата дыскусія вакол вызначэння тэрміна “нацыя” [5]. У ходзе абмеркавання закраналіся пытанні, звязаныя з нацыянальнай самасвядомасцю. Дыскусія гэта вялася ў асноўным філосафамі, якія надалі паняццю нацыянальнай самасвядомасці ідэалагічны, класава-палітычны сэнс. Так, І. Цамеран у сваім артыкуле разглядаў нацыянальную самасвядомасць як элемент ідэалогіі [6, с 15]. Адданасць нацыянальным каштоўнасцям, усведамленне агульнасці інтарэсаў у вызваленчай барацьбе, тыя ці іншыя адносіны да розных этнасаў – усе гэтыя пазіцыі аўтар уключыў у паняцце этнічнай самасвядомасці.

Значная ўвага ўдзялялася праблемам этнічнай самасвядомасці ў манаграфіі Ю. У. Брамлея “Этнас і этнаграфія”. У ёй гаварылася аб памылковасці вывадаў дыскусіі, якая праводзілася часопісам “Вопросы истории”. Ю. У. Брамлей выказаў думку аб уключэнні нацыянальнай самасвядомасці ў лік адзнак этнасу. Ён жа ў манаграфіі “Нарысы тэорыі этнасу” падкрэсліваў, што этнас можа мець, акрамя этноніма, саманазву (эндаэтнонім) і розныя назвы, дадзеныя яму прадстаўнікамі іншых этнічных груп (экзаэтнонімы) [7, с 13]. Ю. У. Брамлей пісаў, што нярэдка ўсведамленне этнічнай прыналежнасці шматзначнае. Прычына гэтага, у адных выпадках, заключаецца ў яго няўстойлівасці, якая вынікае з рознай этнічнай прыналежнасці бацькоў, у другіх выпадках, нядаўна праведзенай змены этнічнай прыналежнасці, у трэціх, наогул, праяўлення іерархічнасці этнічнай структуры.

У навуковых адносінах актуальнасць узгаданай тэмы абумоўлена пэўнай супярэчлівасцю гістарыяграфічных пазіцый па праблемах фарміравання перадумоў і паступовым развіццём у XIX – пачатку XX стст. этнічнай самасвядомасці беларусаў. Сярод айчынных навукоўцаў гэту праблему распрацоўвалі Э.М. Загарульскі, М.Я. Грынблат, М.Ф. Піліпенка, В.К. Бандарчык, Г.Я. Галенчанка, Я.А. Юхо, І.У. Чаквін, І.А. Марзалюк, П.У. Церашковіч, Л.І. Навуменка, Т.М. Мікуліч і інш.

Сучасныя беларускія гісторыкі І. У. Чаквін і П. У. Церашковіч вызначаюць этнічную самасвядомасць як адзін з галоўных аб’ядноўваючых фактараў і называюць яго асноўным паказчыкам узроўню кансалідацыі розных тэрытарыяльна-этнаграфічных груп народа [8, с 45]. Даследчыкі адзначаюць, што вышэйшай формай праяўлення этнічнай самасвядомасці з’яўляецца этнонім. Ён распаўсюджваецца на дэмаграфічны масіў народа паралельна росту інфармацыйных сувязяў паміж рознымі часткамі этнасу ў выніку працэсаў кансалідацыі.

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі першапачаткова не прывяло да істотных змен, як у грамадскіх адносінах, так і ў этнічнай самасвядомасці. Дваране-шляхта ў першай палове XIX ст. у сваёй большасці былі каталікамі ці ўніятамі і лічылі сябе палякамі ці ліцвінамі [11, с 235].

Знакаміты польскамоўны паэт А. Міцкевіч (1798–1855 гг.), які нарадзіўся на Навагрудчыне, пісаў: “Літва. Бацькоўскі край” [12, с.

32]. У творчасці паэта яскрава выступае беларуская тэма: “На беларускай мове, якую называюць русінскай альбо літоўска-русінскай, гаворыць каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацавана.” [13, с. 32]. Беларускі фальклор выкарыстоўваў пісьменнік Ян Баршчэўскі (каля 1794–1851 гг.) ў зборніку “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, іншых творах. Адным са стваральнікаў ідэалогіі нацыянальнага развіцця і самабытнасці беларускага этнасу з’яўляўся Ф. Багушэвіч (1840–1900 гг.), які ў прадмове да зборніка вершаў “Дудка беларуская” пісаў: “Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з’ядналася дабравольна, дык усе яе “Беларусіяй” звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася” [14, с. 250].

Сяляне ў гэты час ужывалі разам з этнонімам “беларусы” і саманазвы “ліцвіны”, “ліцьвіны”, “бужане”, “чарнарусы” і інш. Вызначальным фактарам сацыяльнай эвалюцыі сялянства з’явіліся рэформы другой паловы XIX ст., перш за ўсё, рэформа 1861 г. У селяніна ўмацоўвалася пачуццё ўласнай годнасці, пачала праяўляцца нацыянальная самасвядомасць [15, с. 247]. Усё больш сялян пачало ўсведамляць сябе беларусамі. Пра гэта сведчаць, у прыватнасці, матэрыялы судовых расследаванняў. Так, у студзені 1887 г. непісьменныя сялянкі-каталічкі вёскі Кавалеўцы Мінскага павета І. Залатар, М. Люковіч і інш. абвінавачваліся ў супраціўленні паліцыі і ў час допыту на пытанне следчага аб іх нацыянальнай прыналежнасці адназначна заявілі, што яны беларускі [16, с. 247]. У гэты перыяд пашырылася гуманітарнае вывучэнне Беларусі. Даследчыкі вывучалі беларускую народную культуру – легенды, казкі, песні. Е. Раманаў, М. Федароўскі, А. Кіркор, М. Нікіфароўскі і іншыя ў сваіх працах сцвярджалі, што мова і культура беларускага этнасу самабытная і значная. У 1870 г. выйшаў першы беларуска-рускі слоўнік І. Насовіча.

На працягу 2-й паловы XIX ст. у этнічнай самасвядомасці беларусаў адбыліся істотныя змены. Паводле перапісу 1897 г., 74% насельніцтва Беларусі лічыла роднай мовай беларускую. Да беларусаў адносілі сябе і каля 43% саслоўя дваран. Роднай мовай беларускую лічылі 40% чыноўнікаў, 10% юрыстаў, 20% урачоў,

60% настаўнікаў. Сярод шматмільённага сялянства назва “беларусы” выцясніла большасць лакальных этніконаў тыпу “ліцвіны”, “чарнарусы”. Тэрмін “Беларусь” замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў. Аднак саманазва “беларусы” яшчэ не мела агульнаэтнічнага і ўласна нацыянальнага зместу і асэнсоўвалася як тапонім. Таму разам з ім ужываліся канфесіянізмы (рускія і палякі), а жыхары паўднёва-заходняй і цэнтральнай часткі Беларусі нярэдка называлі сябе тутэйшымі [17, с. 472].

Эндаэтнонім “беларусы” атрымаў шырокае распаўсюджванне ва ўсіх слаях нашага этнасу ў другой палове XIX–пачатку XX стст. пад уплывам розных грамадска-палітычных фактараў. Гэтаму, безумоўна, спрыяла развіццё нацыянальна-дэмакратычнага руху і ўзнікненне ў першай чвэрці XX ст. сучасных форм дзяржаўнасці.

І. У. Чаквін і П. У. Церашковіч, адзначаючы важнае значэнне этноніма, пішуць, што этнічная самасвядомасць выражаецца таксама і ў форме ўсведамлення агульнасці паходжання ўсіх прадстаўнікоў этнасу, у патрыятызме, у пачуцці нацыянальнай годнасці; паказваюць умовы фарміравання этнічнай самасвядомасці [9, с. 47]. Так, на думку аўтараў, розныя сацыяльныя і тэрытарыяльныя этнічныя групы ў эпоху новага часу ўсведамлялі этнічную прыналежнасць неаднолькава, найбольш канцэнтравана этнічная самасвядомасць выражалася пры кантактах з прадстаўнікамі іншых народаў – на этнічным пагранiччы, ў гарадах з іх поліэтнічным насельніцтвам, там, дзе ўзнікала магчымасць супастаўлення і параўнання. “У монаэтнічных, напрыклад, вясковых зонах этнічная самасвядомасць была не так актуальная” [10, с 50], лічаць І.У. Чаквін і П.У. Церашковіч.

Выкарыстаная літаратура

1. Чаквин, И.В. Из истории становления национального самосознания белорусов (XIV–начало XX вв.) / И.В. Чаквин, П.В. Терешкович // Советская этнография. – 1990. – № 6. – С. 42-54.

2. Куличенко, М.И. Расцвет и сближение наций СССР: Проблемы теории и методологии / М.И. Куличенко. – М.: Мысль, 1981. – 444 с.

3. Водовозов, В.Н. Национальность и государство / В.Н. Водовозов. – СПб.: Т-во “Обществ. польза”, 1910. – 821 с.

4. Козлов, В.И. О понятии этнической общности / В.И. Козлов // Советская этнография. – 1967. – № 2. – С. 100-111.

5. Чебоксаров, Н.Н. Проблемы типологии этнических общностей в трудах советских учёных / Н.Н.Чебоксаров // Советская этнография. – 1967. – № 4. – С. 94-109.

6. Рогачев, П.М. О понятии нация / П.М. Рогачев, М.А. Свердлин // Вопросы истории. – 1966. – № 1. – С. 33-48;

7. Джунусов, М.С. Нация как социально-этническая общность / М.С. Джунусов // Вопросы истории. – 1966. – № 4. – С. 16-30.

8. Цамерян, И.Н. Актуальные вопросы марксистско-ленинской теории нации / И.Н. Цамерян // Вопросы истории. – 1967. – № 6. – С. 107-122.

9. Бромлей, Ю.В. Этнос и этнография / Ю.В. Бромлей. – М.: Наука, 1973. – 283 с.

10. Чаквин, И.В. Из истории становления национального самосознания белорусов (XIV–начало XX вв.) / И.В. Чаквин // Советская этнография. – 1990. – № 6. – С. 42-54.

11. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.

12. Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя: Вучэб. дапаможнік / Склад. і аўт. камент. А.А. Лойка, В.П. Рагойша. – Мінск.: Выш. шк., 1998. – 487 с.

13. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3-х т. – Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абергаўз, Х.Ю. Бейлькін, А.Р. Бухавец і інш. // Пад рэд. В.П. Панюціча. – Мінск: Бел. Навука, 2002. – 552 с.

14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.А. Ткачоў [гал. рэд.]. – Мінск. Беларуская энцыклапедыя, 1993–2003. – Т. 1. А — Беліца / М.В. Біч [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. – 494 с.